# ПРЕЗЕНТАЦИЯ

## Ул.А. КУЛАЖАНКА

## *ПЕРШЫ ПАДРУЧНІК ПА ЭКАНАМІЧНАЙ ТЭОРЫІ*

Пад рэдакцыяй вядомых эканамістаў Мікалая Базылева і Сяргея Гурко ў канцы мінулага года ў выдавецтве БДЭУ выйшаў з друку першы на Беларусі падручнік "Эканамічная тэорыя" для студэнтаў эканамічных спецыяльнасцяў вышэйшых навучальных устаноў. Першы не наогул, але пасля пераходу ад выкладання прадмета "палітычная эканомія" да прадмета "эканамічная тэорыя". У параўнанні з вучэбнымі дапаможнікамі экнамістаў палітэхнічнай акадэміі і педагагічнага універсітэта, аўтары якіх стварылі "змешаную" эканамічную тэорыю змешанай эканоміі, гэта значыць не адыйшлі ад марксісцкай метадалогіі, а змяшалі ўсё як толькі маглі і хацелі, аўтары рэцэнзіруемага падручніка сталі на правільны шлях. Не адкідваючы эканамічную тэорыю Маркса, улічваючы вучэнні іншых эканамістаў, у тым ліку і сучасных, аўтары стварылі падручнік менавіта па рыначнай эканоміцы. Нягледзячы на тыя цяжкасці, што ў нашай краіне пакуль што няма рыначнай гаспадаркі. Але бачна па ўсім — будзе. Пэўна, гэтая акалічнасць змусіла аўтараў выводзіць абстракцыі і зыходзіць з абстракцый, здабытых з вопыту краін, якія маюць развітую рыначную эканоміку. І такі падыход правільны, бо іншага выйсця не было.

Аўтары "Эканамічнай тэорыі" — кваліфікаваныя спецыялісты і, нягледзячы на тое, што ў творчы калектыў увайшлі як вопытныя прафесары М.Муталімаў, М.Базылеў і А.Бондар, так і маладыя эканамісты, главы падручніка напісаны больш менш роўна, што аддаць, трэба аднесці да заслугі навуковых рэдактараў.

Падручнік паспяхова прайшоў, як кажуць, першую апрабацыю, бо яго тыраж (і немалы, 5 000 асобнікаў) хутка разышоўся сярод студэнтаў і выкладчыкаў не толькі БДЭУ, але і горада Мінска ды іншых рэгіёнаў краіны. Дадзеная акалічнасць дае падставу зрабіць не толькі агульныя, але і канкрэтныя ацэнкі.

Што датычыцца агульных, то можна зазначыць, што ў падручніку прадстаўлены ўсе раздзелы: агульныя асновы эканамічнай тэорыі, мікраэканоміка, макраэканоміка і сусветная эканоміка. Матэрыял пададзены ў пэўнай паслядоўнасці, што дасць магчымасць студэнту ўспрыняць сістэму эканамічных адносін, як на ўзроўні прадпрыемства, так і краіны, а таксама свету. Тым не менш пры падрыхтоўцы другога выдання, а патрэба ў гэтым відавочная, трэба зрабіць некаторыя дапаўненні. У

*Уладзімір Андрэевіч КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар кафедры эканомікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта.*

прыватнасці, у чацвертым раздзеле "Сусветная эканоміка" адсутнічае глава, прысвечаная эканамічным аспектам глабальных праблем. У другім раздзеле з улікам надзённых праблем нашага грамадства неабходна было б выдзеліць асобную главу, прысвечаную праблемам размеркавання і заработнай плаце, а не разглядаць гэтую актуальную праблему толькі ў сувязі з аналізам цэнаўтварэння на фактары вытворчасці (гл. 12).

Можа варта было б выдзеліць асобную главу, прысвечаную зямельнай рэнце, тым больш што, як высветлілася, элементы маржыналізму ёсць і ў К.Маркса. Сапраўды, велічыню зямельнай рэнты К.Маркс таксама вызначаў паводле гранічных выдаткаў і гранічнага прадукту, які ў стане аплаціць спажывец.

Не памылюся, калі зазначу, што бадай самым моцным бокам падручніка з'яўляецца раскрыццё праблем рыначнага механізма самарэгулявання і рэгулявання з боку грамадства (дзяржавы) эканомікі на мікра- і макраўзроўнях. Гэта датычыцца такіх праблем, як дасягненне аптымальных суадносін пастаянных і пераменных фактараў вытворчасці, выдаткі вытворчасці ў доўгатэрміновым і кароткачасовым перыядзе, мінімізацыя кароткачасовых страт, раўнавага фірмы ва ўмовах дасканалай канкурэнцыі і яе дзейнасці пры чыстай манаполіі, цэнаўтварэнне на рынку рэсурсаў, інвестыцыйная дзейнасць, сістэма макраэканамічных прапорцый, нацыянальны прадукт і формы яго вымярэння і г.д.

Пазнаёміўшыся са зместам падручніка, нельга не заўважыць, што аўтары прытрымліваюцца прынцыпу пераемнасці. Гэта можна праілюстраваць на мностве прыкладаў. Пераемнасць праглядваецца пры разглядзе тэорыі вартасці і сучасных падыходаў да яе вызначэння, трактоўцы прынцыпаў і формаў планавання і прагназавання раней і зараз, цэнаўтварэння, рэгулявання эканомікі і г.д.

Адметнай якасцю падручніка з'яўляецца дыялектычная ўзаемасувязь пры паслядоўнасці разгляду праблем мікраэканомікі і макраэканомікі. Але пры ўсім гэтым у падручніку засталіся мала або недастаткова раскрытымі праблемы ўзнаўлення эканомікі. Аўтары аднеслі іх да першай часткі курса, хоць простае і пашыранае ўзнаўленне ахоплівае як мікраэканамічныя, так і макраэканамічныя адносіны.

Падрыхтоўка і выданне першага ў краіне падручніка па экнамічнай тэорыі даволі сур'ёзная і адказная справа. З гэтае прычыны цяжка абыйсціся без недахопаў. Некаторыя з іх можна пакінуць без увагі, бо аўтары ўбачылі іх самі, калі не адразу, дык потым, пасля выдання падручніка і, безумоўна, ліквідуюць пры падрыхтоўцы другога, больш дасканалага выдання. Але некаторыя заўвагі варта ўсё ж зрабіць. Так, у першай главе "Эканамічная тэорыя як навука" прадмет яе трактуецца такім чынам, быццам ніколі не было палітычнай эканоміі. Нават К.Маркс і Ф.Энгельс працавалі толькі на ніве эканамічнай тэорыі. Між тым, якраз ім належыць творчы падыход да развіцця менавіта палітычнай эканоміі. Тая акалічнасць, што мы перайшлі да выкладання эканамічнай тэорыі, як бы забалатаваўшы палітэканомію (а маглі і не пераходзіць), зусім не выключае блізкасці палітычнай эканоміі і эканамічнай тэорыі. І пра іх прадмет трэба было ў першай главе працы сказаць штосьць канкрэтнае, падкрэсліваючы непрынцыповасць адрозненняў. Тым больш, што у Нямеччыне, Вялікабрытаніі, Францыі ды ў Санкт-Пецярбурзе як быў прадмет палітычнай эканоміі, так і застаўся.

Падручнік намнога выйграў бы, каб была ўжыта новая сімволіка, адпаведная рускаму тэксту. Паўсюль лаціна, першыя літары слоў, якія ніяк не звязаны з тэкставым тлумачэннем. Можа аўтары думаюць, што і ў перакладах "Капіталу" Маркса ўжываецца не славянская сімволіка (c + v + m) або P (прыбытак). Так, але ж не ў такой ступені, як у сучасных трактатах. Там жа, дзе прыводзіцца сімволіка, адпаведная

тэксту, справа выйграе (да прыкладу на ст. 320, 321). Канешне, такі падыход запатрабуе шмат працы, але справа ад гэтага толькі выйграе.

Асобныя главы занадта заакадэмізаваны. Трэба пісаць больш папулярна. Напрыклад, гл. 8 "Тэорыя спажывання" і гл. 9 "Тэорыя вытворчасці фірмы" (адпаведна Л.Вараб'ёвай і А.Каральчука) напісаны на высокім навуковым узроўні. Але ім бракуе лёгкасці выкладу.

Агульным недахопам падручніка з'яўляецца тое, што ён выдадзены не на беларускай мове і не служыць яе адраджэнню.

Напрыканцы можна заключыць, што група аўтараў (эканамістаў БДЭУ) зрабіла вельмі карысную справу, напісаўшы першы на Беларусі падручнік па эканамічнай тэорыі. Пакладзены добры пачатак, працяг якога прынясе яшчэ лепшы плён.




На факультете МЭО и РУ создано структурное подразделение исследовательско-консультационного центра **"ЭКОНОМУНИВЕРСАЛСЕРВИС — БГЭУ"** в целях: совершенствования исследовательской работы в университете, укрепления связей университета с организациями и предприятиями республики, извлечения дополнительных доходов.

Руководитель **БАКУНЧИК Василий Николаевич**, доцент кафедры экономической теории экономических учений.

**Контактные телефоны:**
**249-10-59, 249-32-74.**




Создан исследовательско-консультационный центр по проблемам бухгалтерского учета, анализа, аудита и финансов **"ЭКАУНТИНГЦЕНТР БГЭУ"**. Руководитель **МАТЕЦКИЙ Геннадий Петрович**, декан учетно-экономического факультета.

**Контактный телефон 249-88-14.**




Создан исследовательско-консультационный центр по проблемам экономики, организации, товароведения, маркетинга и менеджмента в торговле **"КОНСАЛТОРГЦЕНТР БГЭУ"**.

Руководитель **КОРОЛЕНОК Геннадий Антонович**, зам. декана ФЭУТ.

**Контактный телефон 220-78-35.**